# НА ВЫСТАЎЦЫ КНІГ

6-га кастрычніка ў Мінску, у Дзяржаўнай бібліятэцы імя У. І. Леніна, адкрылася выстаўка кніг выдавецтваў БССР, прысвечаная XXII з'езду КПСС.

У вочы кідаецца з добрым густам аформлены стэнд палітычнай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Цэнтральнае месца на ім займаюць творы У. І. Леніна. А вось «Пісьмы працоўных Беларусі У. І. Леніну». Тут жа і праект Праграмы Камуністычнай партыі — наш пуцяводны маяк на дваццаць год.

Падоўгу затрымліваюцца наведвальнікі выстаўкі таксама каля серыі брашур у дапамогу слухачам эканамічных школ і гурткоў. Асаблівую ўвагу прыцягваюць брашуры, якія асвятляюць перадавы вопыт герояў нашых дзён—нашых сучаснікаў. Мы бачым брашуру дэлегата XXV з'езда КПБ слесара-зборшчыка аўтапрычэпнага цэха Мінскага аўтамабільнага завода У. В. Прыходчанкі «За тэхнічны прагрэс на кожным рабочым месцы». Цікавая брашура «Будуем горад» брыгадзіра брыгады канчатковай прадукцыі мінскага будтрэста № 4, Героя Сацыялістычнай Працы Д. Р. Булахава, якая расказвае аб арганізацыі і вядзенні мантажных работ на важнейшых стадыях будаўніцтва, аб расстаноўцы людзей, аб выхаванні і абучэнні маладых рабочых.

Кожны, хто пабываў на выстаўцы, спыняўся ля стэнда, за шкло якога беражліва пакладзена тоўстая кніга, названая сурова і проста: «Гераічная абарона». Побач з ёю — ліст паперы, на якой надрукавана пісьмо Маршала Савецкага Саюза тав. Голікава, адрасаванае рэдкалегіі і складальнікам кнігі. Цяжка ўстрымацца, каб не прывесці радкі з гэтага пісьма: «Паважаныя таварышы! Сардэчна дзякую вам за прысланую кнігу, у якой сабраны новыя хвалюючыя матэрыялы аб неўміручым подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівую каштоўнасць кнізе надаюць расказы саміх удзельнікаў абароны Брэсцкай крэпасці — тварцоў яе слаўнай гісторыі. Перакананы, што кніга будзе з цікавасцю сустрэта шырокімі коламі чытачоў і прынясе вялікую карысць у высакароднай справе героіка-патрыятычнага выхавання моладзі...»

Шырока прадстаўлена арыгінальная мастацкая літаратура беларускіх пісьменнікаў. Тут і творы аб героях Вялікай Айчыннай вайны і аб героях нашых дзён.

Аб тым, якая перспектыва намячаецца ў выпуску кніг у БССР, расказвае дыяграма. У 1980 годзе будзе штогод выпускацца 66 мільёнаў кніг, а ў 1940 г. выпускалася 1,1 мільёна. Што і казаць, гіганцкі скачок!

Мастак Галоўвыдавецтва Міністэрства культуры БССР Л. П. Асецкі знаёміць нас са стэндам «Выяўленчая прадукцыя». На гэтым стэндзе вызначаюцца альбом «Ленін у выяўленчым мастацтве Беларусі», манаграфіі аб мастаках, альбомы аб беларускай народнай архітэктуры, тэатрах, цікавыя буклеты, што прапагандуюць перадавых людзей прамысловасці.

Святочна прыгожымі робяць стэнды ўдала размешчаныя каляровыя паштоўкі, выпушчаныя Дзяржаўным выдавецтвам БССР. Яны расказваюць аб выдатных мясцінах Мінска, Гомеля, Брэста, Гродна, аб багацці флоры і фауны Беларусі.

Цікава размешчаны кнігі на стэндах Сельгасвыдавецтва. Віднае месца сярод іх займае серыя навукова-папулярных лекцый па пытаннях сельскай гаспадаркі. Стэнды Дзяржаўнага вучэбна-педагагічнага выдавецтва вызначаюцца на выстаўцы маляўнічасцю рэкламы, прыемнымі свежымі танамі кніжных пераплётаў.

У канцы доўгага калідора бібліятэкі імя У. І. Леніна размясціліся стэнды выдавецтва Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі, нядаўна створанага ў Беларусі.

З цікавасцю наведвальнікі выстаўкі разглядаюць стэнды Мінскага паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа, аформленыя з вялікім густам. Характэрна, што паліграфічны камбінат побач з кнігамі беларускіх аўтараў экспануе і кнігі маскоўскіх выдавецтваў, выпушчаныя на яго базе.

Можна было б прадоўжыць наш расказ аб выстаўцы кніг, прысвечанай XXII з'езду КПСС, але ён не заменіць жывога ўражання. Дзверы выстаўкі шырока адчынены.

**А. НІКІЦІНА.**

## Фільмы на...

...Савецкі цеплаход «Пабеда» робіць турысцкі рэйс па краінах Еўропы. У гадавіну Вялікага Кастрычніка каманда кідае якар у адным з французскіх портаў. Сямён Вострыкаў, савецкі генерал у адстаўцы, разам з групай турыстаў заходзіць у кафэ. Яны займаюць столік. Іх абслугоўвае стары афіцыянт. Гэта — былы князь, капітан Нашчокін, які быў сорак тры гады назад камандзірам Вострыкава і, здрадзіўшы Радзіме, уцёк за граніцу.

Так пачынаецца новая мастацкая кінааповесць «Два жыцці», першая серыя якой будзе паказана гледачам на наступным тыдні. Фільм пастаўлен рэжысёрам Леанідам Лукавым на Маскоўскай кінастудыі імя М. Горкага па сцэнарыю Аляксея Каплера.

— Кінакарціна называецца «Два жыцці». Але не трэба думаць, — гаворыць рэжысёр-пастаноўшчык Л. Лукаў, — што сюжэт яе пабудаван як расказ аб лёсе Сямёна Вострыкава і князя Нашчокіна. Не, і змест і сэнс фільма значна шырэйшыя. Гледачы пазнаёмяцца з многімі героямі: з піцерскім рабочым-бальшавіком Мі-